4. *Сикевич З.В*. Социология и психология национальных отношений: Учеб. пособие. – СПб.: Изд-во В.А.Михайлова, 1999.
5. *Тавадов Г.Т.* Этнология: Учебник. – М.: Проект, 2002.

*А.У.Свечнікава*

## ВАЙНА З ЦЕНЕМ

Стваральнік аналітычнай псіхалогіі, філосаф і культуролаг К.Г.Юнг лічыў, што ўсё існае ў аснове сваёй адзінае. Але і асобны чалавек, і грамадства адчуваюць уплыў унутраных супярэчнасцей. Тое, што можа і павінна быць гарманічным, у рэчаіснасці сапсавана дысгармоніяй.

Як пісаў Т.Гобс, інстынктыўна, дзеля самазахавання, чалавек ахоўвае сваю свабоду і ў той жа час дабіваецца панавання над іншымі людзьмі. Дзяржава ў дачыненні да іншых дзяржаў паводзіць сябе так, як і асобны індывід. Сапраўды, усякая ўпарадкаваная сістэма нясе ў сабе пачатак распаду і хаосу. К.Г.Юнг згадваў пра закон энантыядроміі, паводле якога ўсё перацякае ў сваю супрацьлегласць. Так, рацыянальная культурная ўстаноўка абарочваецца ў ірацыянальнае культурнае апусташэнне; усе хочуць міру, але садзейнічаюць вайне.

Найноўшая гісторыя – “набор” супрацьстаянняў: Усходу і Захаду, капіталістычнай і сацыялістычнай сістэм і інш. Нельга не ўлічваць таксама глыбінныя супярэчнасці рацыянальнага і ірацыянальнага ў чалавечай душы і ў соцыуме.

Паспрабуем прымяніць канцэпцыю прыроджаных эмацыянальна-інтэлектуальных патэрнаў паводзін (архетыпаў) для аналізу соцыуму і палітычных канфліктаў.

Гісторыя чалавецтва – гэта гісторыя войнаў. “Вечным рухавіком” бунтаў, войнаў, рэвалюцый, паводле К.Г.Юнга, з’яўляецца архетып ценю. Адносна асобы гэтая дамінанта калектыўнага несвядомага азначае “негатыў”, менавіта скрытыя, нявыгадныя ўласцівасці, недастаткова развітыя функцыі і змест асабістага несвядомага, усё тое, што свядомасць ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раецца не заўважаць. У грамадстве цень – гэта людзі і групы па-за сістэмай, “унутраны вораг”, а таксама тое, што ніколі не знойдзе адлюстравання ў самавобразе народа. Так, міф пра талерантнасць можа прыкрываць нацыянальную нецярпімасць.

Што адбываецца, калі свядомасць грамадства заняволена архетыпамі? Архетып уключае ў сябе не толькі ўсё прыгожае і вялікае, але і ўсё дрэннае, подлае і жорсткае, на што здольна чалавецтва. Суб’ект, які знаходзіцца пад прыгнётам уласных праекцый, прыпісвае “іншаму” адмоўныя якасці, узносіць яго да нябёс або ўпадае ў самаабагаўленне, прыніжэнне. Архетып можа выклікаць інфляцыю (празмерную гордасць), залежнасць, ілюзію і апантанасць.

Такім чынам, у грамадскай свядомасці пастаянна прысутнічае вобраз ворага, праекцыя на іншага (іншых) уласных негатыўных якасцей. Так, “крыжовыя паходы” супраць таталітарных дзяржаў часта маскіруюць уласнае дрэннае становішча ініцыятара канфліктаў. Непрыманне супрацьлегласцей у сабе спараджае непрымірымасць у адносінах да знешняга свету. Гісторыя пацвярджае гэта.

У прэсе Амерыку называюць краінай падлеткаў. Гэта мае падставы. Юнацкі максімалізм (рэзкае раздзяленне супрацьлегласцей), арыентацыя не на сілу доказаў, а на доказ сілы, прынцып “вока за вока”, а не “любіце ворагаў вашых”, эгацэнтрызм у пэўнай ступені абумоўлены перадгісторыяй краіны. На працягу стагоддзяў фарміравалася свядомасць грамадства, якое складаецца з пасіянарыяў, людзей, схільных да рызыкі, і так званых “ selforiented personalities” (асоб, арыентаваных на саміх сябе), якія адстойваюць свае інтарэсы нярэдка са зброяй у руках. Хаця, на думку даследчыкаў, эгацэнтрычную асобу змяніла “альтэрцэнтрычная” (otheroriented personality), гэтае сцвярджэнне здаецца спрэчным. Па-першае, існуюць двайныя стандарты (накшталт гобсаўскай свабоды для сябе – рабства для іншых). Па-другое, палітычны месіянізм: “... толькі Амерыка можа весці за сабой свет. Амерыка застаецца адзінай глабальнай, універсальнай цывілізацыяй у гісторыі чалавецтва... Без энергічнай амерыканскай цывілізацыі на нашай планеце будуць множыцца варварства, гвалт і дыктатура...” [1, с. 12]. Па-трэцяе, невы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падкова з’явілася паняцце “штучнай глабалізацыі”, якое характарызуе “прэтэнзіі той ці іншай краіны, рэлігіі, палітычнай ідэі і г.д. стаць універсальнай, усеагульнай, абсалютнай каштоўнасцю” [2, с. 7] і падразумявае метады дасягнення такой універсальнасці: падман, подкуп, гвалт. На думку І.М.Падзігун, штучная глабалізацыя ў асноўным разумеецца як амерыканізацыя. Здаецца, сапраўды існуе краіна з элементамі псіхалогіі дзіцяці, якое лічыць сябе цэнтрам сусвету і імкнецца ўвесь свет падпарадкаваць сваёй волі.

Дж.Сорас так вызначыў каштоўнасці капіталістычнай сістэмы: у аснове яе – канкурэнцыя, поспех вымяраецца грашамі, якія “падмяняюць сабой рэальныя каштоўнасці” [2, с.11]. На грошы праектуецца цэннасць, якой яны на самай справе не маюць.

Грамадская свядомасць, унутрана раздробленая, не можа ўсвядоміць сваю няцэласнасць, неінтэграванасць несвядомага. Калектыўнае несвядомае ўвесь час пранікае ў свет рацыянальнага і ўносіць у яго хаос.

Напрыклад, дзяржава пад уладай анімы можа характарызавацца нематываваным антаганізмам у дачыненні да іншых членаў сусветнага супольніцтва. Такая дзяржава не здольная пераканаць ні свой народ, ні сусветную грамадскасць у тым, што, напрыклад, неабходна тэрмінова развязаць “свяшчэнную вайну” супраць чарговых “няверных”.

Тэорыя калектыўных паводзін Н.Смелсера дэманструе ірацыянальны фактар у развіцці канфлікту: успышкі гвалту і нянавісці падрыхтоўваюцца масавай псіхікай. На зыходную сітуацыю няпэўнасці грамадская свядомасць рэагуе чуткамі і істэрыяй. А несвядомае пазбаўляецца ад нявызначанасці фарміраваннем вобраза ворага (абсалютнай пагрозы), прычым ворага ўяўнага.

З пункту гледжання псіхалогіі, пошук знешняга ворага азначае наяўнасць унутранага. У іншых ненавідзяць тое, што непрымальна ў сабе. Напрыклад, калі нейкая дзяржава аб’яўляе іншую крыніцай зла, тым самым яна выяўляе сваю сутнасць – свой цень. Далей падзеі развіваюцца па вядомым сцэнарыі: зыходзячы з уяўнага і дэклараванага “нацыянальнага інтарэсу” аб’яўляецца вайна. Гаворачы словамі апостала Паўла, “…і ці трэба рабіць нам зло, каб атрымалася дабро?..”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І робяць!

Юнгіянцы лічаць, што дзейнічаць трэба было б інакш: неабходна асіміляваць свой цень, а для пачатку хаця б убачыць яго. Мана-асоба, “сябар Божы”, які прысвойвае сабе боскія паўнамоцтвы – права судзіць і помсціць, –не разумее ступені сваёй інфляцыі (і яе вынікаў). “Няўжо думаеш ты, чалавек, што пазбегнеш суда Боскага, асуджаючы тых, хто робіць такія *справы*, і (сам) робячы тое ж самае?” (Рым. 2:3).

У індывідуальнай псіхіцы Я прэтэндуе на ролю цэнтра асобы, хаця такім не з’яўляецца. Цэнтр – тое, што рэлігійны чалавек называе Богам. У калектыўнай псіхіцы на ролю цэнтра прэтэндуе дзяржава.

Можа быць, над дзяржаўнымі інтарэсамі павінны стаяць агульначалавечыя? Паводле слоў М.Фёдарава, кожны народ “ёсць толькі частка цэлага роду чалавечага, частка, якая будзе бясплодная без аб’яднання з усімі іншымі народамі”.

---


1. *Здравомыслов А.Г.* Социология конфликта: Россия на путях преодоления кризиса: Учеб. пособие для студентов высших учебных заведений. – 2-е изд., доп. – М.: Аспект Пресс, 1995. – 317 с.
2. *Подзигун И.М.* Глобализация как реальность и проблема // Философские науки. – 2003. – № 1. – С. 5–16.
3. *Самуэлс Э.* Юнг и постъюнгианцы. Курс юнгианского психоанализа / Пер. с англ. – М.: ЧеРо, 1997. – 416 с.: ил.
4. *Эдингер Э.Ф.* Эго и архетип / Пер. с англ.– М.: ООО “ПентаГрафик”, 2000. – 264 с.
5. *Юнг К.Г.* Архетип и символ / Сост. и вступ.ст. А.М.Руткевича. – М.: Ренессанс, 1991. – 304 с.
6. *Юнг К.Г.* Современность и будущее. – Мн.: Университетское, 1992. – 62 с.



*Л.А.Старцава*


## ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМЫ ЖАНОЧАЙ АДУКАЦЫІ Ў XV – ПАЧАТКУ XVIII ст.

Эпоха Адраджэння з’яўляецца пераломнай у гісторыі еўрапейскай філасофскай думкі. Зменам светапогляду ў гэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ